ТЭМА: Нарматыўныя прававыя асновы дзейнасці настаўніка-дэфектолага

Пытанні лекцыі:

1. Прававыя асновы дзейнасці настаўніка-дэфектолага: міжнародныя і дзяржаўныя прававыя акты.
2. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі - асноўны дакумент, які рэгламентуе дзейнасць педагога сістэмы спецыяльнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пытанне 1. Прававыя асновы дзейнасці настаўніка-дэфектолага: міжнародныя і дзяржаўныя прававыя акты.**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Імплементацыя** (міжнароднага права) - фактычнае ажыццяўленне міжнародных абавязацельстваў на ўнутрыдзяржаўным узроўні шляхам трансфармацыі міжнародна-прававых нормаў у нацыянальныя законы і падзаконныя акты.

**Ратыфікацыя** - працэс надання юрыдычнай сілы дакумента (напрыклад, дамовы) шляхам зацвярджэння яго адпаведным органам кожным з бакоў. Да ратыфікацыі такі дакумент, як правіла, не мае юрыдычнай сілы і не абавязковы.

У шэрагу дзяржаў ратыфікаваныя міжнародныя дагаворы аўтаматычна становяцца часткай нацыянальнага заканадаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Індывідуальныя адукацыйныя патрэбы асобы

- патрэбы ў паўнацэнным і разнастайным асобасным станаўленні і развіцці - з улікам індывідуальных схільнасцей, інтарэсаў, матываў і здольнасцяў;
- патрэбы ў арганічным ўваходжанні асобы ў сацыяльнае асяроддзе і плённым удзеле ў жыцці грамадства;
- патрэбы ў развіцці ў асобы ўніверсальных працоўных і практычных уменняў, гатоўнасці да выбару прафесіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Міжнародныя нарматыўныя прававыя дакументы

## ААН

| | |
|---|---|
| Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (1948) | • роўнасць усіх людзей «у сваю годнасць і правах" (права на сацыяльнае забеспячэнне і на ажыццяўленне неабходных для вольнага развіцця асобы правоў у эканамічнай, сацыяльнай і культурнай галінах, права на адукацыю) |
| Канвенцыя аб барацьбе з дыскрымінацыяй у галіне адукацыі (1960) | • правы дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на адукацыю ў спецыяльных навучальных установах і ў звычайных школах сярод аднагодкаў у залежнасці ад іх магчымасцяў. |
| Дэкларацыя аб правах разумова адсталых асоб (1971) | • права на належнае медыцынскае абслугоўванне і лячэнне; права на адукацыю, аднаўленне працаздольнасці і заступніцтва; права на матэрыяльнае забеспячэнне і на здавальняючы жыццёвы ўзровень; права на абарону ад эксплуатацыі, злоўжыванняў і прыніжальнага абыходжання; па магчымасці права жыць у коле сваёй сям'і і інш. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Міжнародныя нарматыўныя прававыя дакументы

## ААН

| Дэкларацыя аб правах інвалідаў (1975) | • права інвалідаў на павагу іх чалавечай годнасці;<br>• на асноўныя правы суграмадзян іх узросту, якімі б ні былі паходжанне, характар і сур'ёзнасць іх недахопаў;<br>• права на медыцынскае лячэнне, аднаўленне здароўя і становішча ў грамадстве;<br>• права на адукацыю, рамесную прафесійную падрыхтоўку, права на атрыманне ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі і захаванне за сабой працоўнага месца;<br>• права жыць у коле сваёй сям'і ці ва ўмовах, спрыяльных для іх, удзельнічаць ва ўсіх відах грамадскай дзейнасці і вольнага часу, карыстацца кваліфікаванай юрыдычнай дапамогай. |
|---|---|

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Міжнародныя нарматыўныя прававыя дакументы ААН

Канвенцыя аб правах дзіцяці (1989)

- вызначаны пералік правоў дзяцей і абавязкі дзяржавы па абароне і дапамоге;
- замацаваны правы такіх дзяцей на адпаведны ўзровень медыцынскага абслугоўвання

Рэспубліка Беларусь далучылася да Канвенцыі аб правах дзіцяці летам 1990 года

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Міжнародныя нарматыўныя прававыя дакументы ААН

**Стандартныя правілы забеспячэння роўных магчымасцяў для інвалідаў (1993)**

- які сцвярджаюць маральныя і палітычныя абавязацельства дзяржавы ў дачыненні да забеспячэння роўнасці і магчымасцяў для інвалідаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Міжнародныя нарматыўныя прававыя дакументы

Саламанская дэкларацыя аб прынцыпе, палітыцы і практычных дзеяннях у сферы адукацыі асоб з асаблівымі патрэбамі

(1994)

- кожнае дзіця мае права на адукацыю і павінна мець права атрымліваць і падтрымліваць прымальны ўзровень ведаў;
- кожнае дзіця мае ўнікальныя асаблівасці, інтарэсы, здольнасці і навучальныя патрэбы;
- неабходна распрацоўваць сістэмы адукацыі і выконваць адукацыйныя праграмы такім чынам, каб прымаць пад увагу шырокую разнастайнасць гэтых патрэбаў і магчымасцяў;
- асобы, якія маюць асаблівыя патрэбы ў галіне адукацыі, павінны мець доступ да атрымання адукацыі ў звычайных школах, якія павінны ствараць ім умовы на аснове педагагічных падыходаў, арыентаваных, у першую чаргу на дзяцей, з мэтай задавальнення гэтых патрэб.
- Школы з такой інклюзіўнай арыентацыяй з'яўляюцца найлепшым сродкам барацьбы з дыскрымінацыйнымі поглядамі, стварэння спрыяльнай атмасферы ў соцыуме, пабудовы інклюзіўнага грамадства і забеспячэння адукацыі для ўсіх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Міжнародныя нарматыўныя прававыя дакументы ААН

Канвенцыя аб правах інвалідаў

(прынятая Генеральнай Асамблеяй ААН

13 снежня 2006 года і якая ўступіла ў сілу 3 мая 2008 года)

- сфармуляваны сацыяльны падыход да разумення інваліднасці: «інваліднасць з'яўляецца вынікам ўзаемадзеяння, якое ўзнікае паміж маючымі парушэнні здароўя людзьмі і срэдавымі бар'ерамі».

Да 2011 г. Канвенцыю падпісалі 148 дзяржаў - членаў ААН, у тым ліку і РФ, якая ў 2012 годзе яе ратыфікавала. Рэспубліка Беларусь ратыфікавала Канвенцыю ў 2016 годзе.

У адрозненні ад дэкларацыі, канвенцыя - гэта дакумент «строгага дзеяння», які патрабуе выканання дзяржавамі-удзельнікамі ўзятых на сябе абавязацельстваў. Канвенцыя аб правах інвалідаў зафіксавала вынік гістарычнага развіцця міжнароднага права ў галіне адукацыі: ад 1948 года да 2006: ад заявы ў Сусветнай дэкларацыі аб праве кожнага чалавека на адукацыю - да абавязацельстваў рэалізоўваць гэта права пасродкам інклюзіўнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Нацыянальныя нарматыўныя прававыя дакументы

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь

(15 марта 1994 г.)

- Абвяшчае чалавека, яго правы, свабоду і гарантыі іх рэалізацыі ў якасці вышэйшай каштоўнасці і мэты грамадства і дзяржавы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці» (1993)

- Пазначае пазіцыі грамадства і дзяржавы ў адносінах да дзяцей з паруўэннямі, іх права на адукацыю (у тым ліку прафесійную), пражыванне ў сям'і, медыцынскае абслугоўванне і інш.

**Пытанне 2. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі - асноўны дакумент, які рэгламентуе дзейнасць педагога сістэмы спецыяльнай адукацыі.**

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ўступіў у сілу 01. 09.2011.

Адукацыя падзяляецца на асноўную, дадатковую і спецыяльную.

Спецыяльную адукацыю - навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія з'яўляюцца асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, праз рэалізацыю адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўнях дашкольнай, агульнай сярэдняй адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі вызначае і рэгламентуе:

- прававыя, эканамічныя, сацыяльныя і арганізацыйныя асновы спецыяльнай адукацыі;
- магчымасці і ўмовы атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Прававыя гарантыі для навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця:

- стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцей псіхафізічнага развіцця;
- бясплатнае псіхолага-медыка-педагагічнае абследаванне, якое праводзіцца ў дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі;
- бясплатная карэкцыя фізічных і (або) псіхічных парушэнняў у дзяржаўных установах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі;
- падвоз ва ўстановы адукацыі на спецыяльна абсталяваных транспартных сродках;
- бясплатнае карыстанне падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі;
- бясплатнае пражыванне і харчаванне ва ўстановах спецыяльнай адукацыі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ТЭМА: Нарматыўныя прававыя асновы дзейнасці настаўніка-дэфектолага

Пытанні лекцыі:

1. Прававыя асновы дзейнасці настаўніка-дэфектолага: міжнародныя і дзяржаўныя прававыя акты.
2. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі - асноўны дакумент, які рэгламентуе дзейнасць педагога сістэмы спецыяльнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ